# Навуковы камунізм

А. П. МЕЛЬНІКАЎ

## ДАСЛЕДАВАННЕ ВУЧОНЫМІ БЕЛАРУСІ ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДНОСІН

У нашай рэспубліцы цікавасць да праблемы нацыянальных адносін прыкметна ўзмацнілася к канцу 70-х — пачатку 80-х гадоў. Асаблівую ўвагу вучоныя Беларусі ўдзяляюць праблемам інтэрнацыяналізацыі, пралетарскага і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. Па гэтых пытаннях у апошняе дваццацігоддзе выйшлі такія работы, як «Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме», «Інтэрнацыянальнае і нацыянальнае ў грамадстве развітога сацыялізму» І. І. Сяровай, «Сацыялістычны інтэрнацыяналізм — наш сцяг» А. А. Ясінскага, «Інтэрнацыяналізацыя: сутнасць, тэндэнцыі, перспектывы» і некаторыя іншыя. У гэтых кнігах пралетарскі інтэрнацыяналізм разглядаецца як агульнасць інтарэсаў і салідарнасць рабочых, працоўных розных нацый, якія праяўляюцца ў іх псіхалогіі, ідэалогіі і сацыяльнай практыцы, як міжнароднае адзінства рабочага класа, камуністаў усіх краін у барацьбе за агульныя мэты, салідарнасць іх з барацьбой народаў за нацыянальнае вызваленне і сацыяльны прагрэс, добраахвотнае супрацоўніцтва брацкіх партый пры захаванні раўнапраўя і незалежнасці кожнай з іх.

Інтэрнацыяналізм непарыўна звязаны з патрыятызмам, гэта значыць любоўю да айчыны, адданасцю ёй, імкненнем сваімі дзеяннямі служыць яе інтарэсам. Патрыятызм — «адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, замацаваных вякамі і тысячагоддзямі адасобленных айчын»[1]. У названых работах правільна паказваецца, што ў антаганістычным грамадстве змест патрыятызму з'яўляецца класавым, бо кожны клас выказвае свае адносіны да айчыны праз уласцівыя яму спецыфічныя інтарэсы. Патрыятызм пралетарыяту, напрыклад, заўсёды супярэчлівы. У ім любоў да радзімы спалучаецца з нянавісцю да эксплуататарскага строю. Сацыялістычны патрыятызм не супярэчыць інтэрнацыяналізму. У ім любоў да радзімы, свайго народа арганічна спалучаецца з паважлівымі адносінамі да іншых народаў.

Раскрываючы суадносіны пралетарскага і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, аўтары падкрэсліваюць іх непарыўнае адзінства, выводзяць агульныя рысы, адзначаюць, што сацыялістычны інтэрнацыяналізм варта разглядаць як якасна новую ступень развіцця пралетарскага інтэрнацыяналізму.

У працах беларускіх даследчыкаў аналізуюцца розныя бакі працэса інтэрнацыяналізацыі, прапануецца яе перыядызацыя. Пэўны навуковы інтарэс уяўляе спроба ўдакладніць змест паняццяў «інтэрнацыяналізацыя» і «інтэграцыя», іх суадносіны. З класавых пазіцый характарызуюцца два розныя тыпы інтэрнацыяналізацыі — капіталістычная і сацыялістычная. У аснову такога падыходу пакладзена вядомая ленінская думка аб тым, што «ўсё гаспадарчае, палітычнае і духоўнае жыццё чалавецтва ўсё больш інтэрнацыяналізуецца ўжо пры капіталізме. Сацыялізм цалкам інтэрнацыяналізуе яго»[2].

Вызначаючы інтэрнацыяналізацыю як аб'ектыўную тэндэнцыю грамадскага развіцця, якая выражае ў перспектыве працэс растучага адзінства ўсіх нацый і народаў у адзіным безнацыянальным камуністычным чалавецтве, аўтары разам з тым падкрэсліваюць, што ўмовы для раскрыцця сутнасці гэтай тэндэнцыі, яе поўнай рэалізацыі ствараюцца толькі з перамогай сацыялізму.

Аргументавана і наглядна даследчыкі раскрываюць усё ўзрастаючы ўплыў сусветнай сістэмы сацыялізму як на ход сусветнага развіцця, так і на характар інтэрнацыяналізацыі ўсіх бакоў жыцця народаў сацыялістычных краін. У калектыўнай манаграфіі «Інтэрнацыяналізацыя: сутнасць, тэндэнцыі, перспектывы» (Мінск, 1977) паказана, што найбольш інтэнсіўна працэс інтэрнацыяналізацыі развіваецца ў сацыялістычным супрацоўніцтве краін СЭУ.

У сучасную эпоху асабліва важнае значэнне набыло ўменне спалучаць інтэрнацыянальнае і нацыянальнае ў класавай барацьбе, рэвалюцыі, будаўніцтве сацыялізму, а значыць, уменне абараняць паслядоўны інтэрнацыяналізм супраць любых спроб падмены класавых крытэрыяў вырашэння грамадскіх праблем «чыста нацыянальнымі» крытэрыямі.

У названых працах, а таксама ў манаграфіі А. І. Галаўнёва «Інтэрнацыянальнае і нацыянальнае ў развіцці сацыялістычнай культуры» (Мінск, 1974) разглядаецца дыялектыка інтэрнацыянальнага і нацыянальнага як у сацыялістычным, так і ў несацыялістычным свеце. Вывучэнне інтэрнацыянальнага і нацыянальнага ў сусветным кантэксце дае магчымасць лепш адцяніць перавагі сацыялізму перад капіталізмам у развіцці нацый і нацыянальных адносін.

Даследчыкі выступаюць супраць спроб тлумачыць інтэрнацыяналізм як нігілістычныя адносіны да ўсяго нацыянальнага ў жыцці народаў. Сапраўдны інтэрнацыяналізм заключаецца менавіта ў тым, каб глыбока ўлічваючы нацыянальныя фактары грамадскага развіцця, паслядоўна змагацца супраць нацыянальнай выключнасці і ўсіх форм адасаблення, за брацкае адзінства народаў, іх супрацоўніцтва і ўзаемадапамогу.

Нямала ўвагі беларускія грамадазнаўцы ўдзяляюць нацыянальным адносінам у СССР, росквіту і збліжэнню савецкіх нацый і народнасцей, а таксама ўзмацненню іх сувязей з краінамі сацыялістычнай садружнасці. У гэтым плане вельмі паказальныя працы М. І. Іоські «Беларусія і Узбекістан: З гісторыі развіцця міжнацыянальных адносін беларускага і ўзбекскага народаў» (Мінск, 1970); І. С. Сямыкіна «XXIV з'езд КПСС аб заканамернасцях развіцця сацыялістычных нацый» (Мінск, 1972); А. П. Мельнікава «Збліжэнне савецкіх нацый ва ўмовах развітога сацыялізму» (М., 1973); З. У. Доктарава «Адзінае саюзнае, шматнацыянальнае: Нацыянальна-дзяржаўнае ўстройства СССР» (Мінск, 1978); В. П. Дзікселіса «Росквіт і збліжэнне нацый ва ўмовах развітога сацыялізму» (Мінск, 1981); І. С. Сямыкіна, А. І. Сямыкіна «У брацкім саюзе» (Мінск, 1982); А. А. Ясінскага «Сябры-інтэрнацыяналісты» (Мінск, 1973).

У гэтых публікацыях раскрываюцца інтэграцыйныя пытанні, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя асновы збліжэння савецкіх нацый і народнасцей, паказваецца, што гэта збліжэнне ўзмацняецца па меры ўдасканалення матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму, інтэрнацыяналізацыі сацыяльна-класавых асноў савецкага грамадства.

У працах падкрэсліваецца, што важныя формы збліжэння савецкіх нацый і народнасцей выяўляюцца ў сукупнай працы шматнацыянальных калектываў, у абмене працоўнымі рэсурсамі, які пашыраецца, падрыхтоўцы кадраў, укараненні перадавога вытворчага вопыту, сацыялістычным спаборніцтве саюзных рэспублік, гарадоў, родненых прадпрыемстваў. На падставе ўмацавання адзінства эканомікі нацый і народнасцей СССР ўдасканальваецца сацыялістычная дэмакратыя, павышаецца роля нацыянальнай дзяржаўнасці ў вырашэнні інтэрнацыянальных задач савецкага народа. Адпаведна, далейшае развіццё атрымліваюць савецкая федэрацыя і аўтаномія як важнейшыя формы забеспячэння ўсебаковага росквіту і збліжэння савецкіх народаў, дасягнення іх поўнага адзінства.

У адрозненне ад інтэрнацыяналізацыі ў капіталістычным грамадстве сацыялістычная інтэрнацыяналізацыя ажыццяўляецца планамерна, шляхам свядомага выкарыстання аб'ектыўных законаў сацыялізму, усебаковага ўліку патрэб сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта садзейнічае ўмацаванню інтэрнацыянальнага адзінства не толькі савецкіх народаў, але і краін сацыялістычнай садружнасці, паскарэнню іх развіцця, правільнаму

спалучэнню інтэрнацыянальных і нацыянальных інтарэсаў. Гэта, у прыватнасці, добра паказана ў працы А. А. Ясінскага «Сябры-інтэрнацыяналісты».

Планамернае збліжэнне сацыялістычных нацый адбываецца ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Найбольш складанай у гэтых адносінах з'яўляецца духоўная культура. Раскрыццю праблем інтэрнацыяналізацыі духоўнага жыцця прысвечаны такія працы беларускіх даследчыкаў, як «Нацыянальная культура і камунізм», «Інтэрнацыянальнае і нацыянальнае ў развіцці сацыялістычнай культуры» А. І. Галаўнёва (Мінск, 1967; 1974); «Збліжэнне нацыянальных культур у працэсе камуністычнага будаўніцтва (на матэрыялах культуры ўкраінскага і беларускага народаў)», «Адзінства братніх культур» А. П. Мельнікава (Мінск, 1972; 1978); «Узаемаабагачэнне і збліжэнне нацыянальных культур у перыяд будаўніцтва камунізму» П. П. Сіліванчыка і А. П. Мельнікава (Мінск, 1974); «Збліжэнне нацыянальных культур у працэсе камуністычнага будаўніцтва» А. І. Галаўнёва і А. П. Мельнікава (Мінск, 1979).

У гэтых працах паказана, што паколькі сацыялізм істотна мяняе ўвесь жыццёвы ўклад, спосаб жыцця нацый і народнасцей, пастолькі глыбока змяняюцца іх нацыянальныя спецыфіка і асаблівасці. Узаемадзейнічаючы, яны губляюць былы ізаляваны характар, становяцца ўсё больш даступнымі, зразумелымі для прадстаўнікоў усіх нацыянальных супольнасцей. Гэта пашырае аснову ўзаемаабагачэння нацыянальных культур.

У манаграфіях А. І. Галаўнёва грунтоўна даследуюцца суадносіны інтэрнацыянальнага і нацыянальна-асаблівага ў развіцці сацыялістычнай культуры, робіцца вывад аб тым, што нацыянальна-самабытнае, як у сферы вытворчасці духоўных каштоўнасцей, так і ў сферы іх асваення, выступаючы формай выяўлення агульнага, інтэрнацыянальнага, звязана з гэтым апошнім як самабытнае і агульнае, як форма і змест.

Значная ўвага ва ўказанных працах надаецца разгляду дыялектыкі тэндэнцый росквіту і збліжэння ў паступальным развіцці сацыялістычнай культуры, даследуецца ўзаемадзеянне нацыянальных культур як блізкароднасных нацый (беларускай, украінскай, рускай), так і «дальніх» народаў (беларускага і ўзбекскага). У манаграфіі А. І. Галаўнёва і А. П. Мельнікава «Збліжэнне нацыянальных культур у працэсе камуністычнага будаўніцтва» шмат ўвагі ўдзяляецца таксама ўзаемадзеянню культуры савецкага народа як новай гістарычнай супольнасці людзей з культурамі народаў сацыялістычных краін. Манаграфія насычана багатым фактычным матэрыялам, які ілюструе тэндэнцыю да культурнай кансалідацыі краін сацыялістычнай садружнасці.

Значную ўвагу беларускія вучоныя ўдзяляюць праблемам інтэрнацыянальнага выхавання працоўных у сучасных умовах. Гэтым пытанням прысвечаны публікацыі І. І. Сяровай «Інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных» (Мінск, 1974); «Сіла, якая згуртоўвае ў адно: Інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных у развітым сацыялістычным грамадстве» (Мінск, 1981), а таксама Г. Е. Таіравай «Сацыялістычная інтэрнацыяналісцкая ідэалогія» (Мінск, 1974).

У працах І. І. Сяровай даецца разгорнуты аналіз праблемы інтэрнацыянальнага выхавання працоўных у сацыялістычным грамадстве. Аўтар правамерна падкрэслівае, што для правільнай пастаноўкі інтэрнацыянальнага выхавання неабходны глыбокае ўсведамленне сапраўдасці і выпрацоўка мэт, якія адпавядаюць духу часу і рэальнаму становішчу спраў.

У працах І. І. Сяровай і Г. Е. Таіравай раскрываецца таксама сутнасць савецкай агульнанацыянальнай гордасці, яе структура, фактары фарміравання, сацыяльныя функцыі, суадносіны з нацыянальнай свядомасцю.

Пэўную ўвагу даследчыкі ўдзяляюць пытанням крытыкі антыкамуністычных паклёпаў на ленінскую нацыянальную палітыку. Гэтым праблемам прысвечана манаграфія Г. С. Марцуля «Перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе буржуазныя фальсіфікатары» (Мінск, 1975) і брашура М. П. Чапрасава «Крытыка антыкамуністычных фальсіфікацый нацыянальнай палітыкі КПСС» (Мінск, 1978).

У названых працах разглядаюцца прыёмы нашых ідэйных праціўнікаў, на падставе якіх яны скажаюць марксісцка-ленінскае вучэнне па нацыянальнаму пытанню, спрабуюць прынізіць ролю К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна ў распрацоўцы тэорыі нацыі і нацыянальных адносін. Вялікую ўвагу даследчыкі ўдзяляюць выкрыццю буржуазных фальсіфіка-

цый ленінскай праграмы партыі па нацыянальнаму пытанню, у прыватнасці, яе важнейшага палажэння — аб праве нацый на самавызначэнне. Праца Г. С. Марцуля дае грунтоўную крытыку поглядаў буржуазных ідэолагаў па праблеме ленінскага вучэння аб пралетарскім інтэрнацыяналізме, ускрывае рэакцыйную сутнасць буржуазнага нацыяналізму і адной з яго разнавіднасцей — сіянізму.

Гаворачы аб пэўных дасягненнях у распрацоўцы вучонымі Беларусі праблем нацыянальных адносін, нельга не адзначыць, што гады застою не маглі не адбіцца адмоўна і ў гэтай справе. У некаторых рэгіёнах краіны пачалі даваць знаць аб сабе праяўленні месніцтва, тэндэнцыі да нацыянальнай замкнутасці, настроі нацыянальнай фанабэрыі, а часам і непаважлівыя адносіны да інтарэсаў нацыянальнага развіцця. Аднак гэтыя з'явы заставаліся па-за полем зроку грамадазнаўцаў. Як адзначаў у сувязі з гэтым М. С. Гарбачоў, «некаторыя нашы грамадазнаўцы доўгі час лічылі за лепшае ствараць трактаты «заздароўнага» характару, якія нагадвалі часам больш хвалебныя тосты, чым сур'ёзныя навуковыя даследаванні»[3]. У далейшым парушэнне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі, недастатковая ўвага да яе прывялі да сумна вядомых падзей у Алма-Аце, Прыбалтыцы, Нагорным Карабаху. Усё гэта ставіць перад нашымі вучонымі новыя задачы па больш глыбокаму і сур'ёзнаму вывучэнню складанай і далікатнай сферы нацыянальных адносін.

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 28. С. 169.
[2] Там жа. Т. 19. С. 222.
[3] Матэрыялы Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС, 27—28 студзеня 1987 г. Мінск, 1987. С. 42.

МИЛЕНА СТИБОРОВА

# НЕКОТОРЫЕ АСПЕКТЫ УСИЛЕНИЯ МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКОЙ НАПРАВЛЕННОСТИ УЧЕБНОГО ПРОЦЕССА В ТЕХНИЧЕСКИХ ВУЗАХ ЧССР

XVII съезд КПЧ, состоявшийся в марте 1986 года, выработал стратегию ускорения социально-экономического развития государства и всех сфер общества на ближайшие пятнадцать лет. Основным условием ускорения социально-экономического развития ЧССР должна стать интенсификация народного хозяйства на основе научно-технического прогресса. Декабрьский (1986) Пленум ЦК КПЧ поставил задачу ускорить внедрение достижений науки и техники, обеспечить высокий технический уровень и качество продукции. Выполнение этой ответственной задачи невозможно без активного участия научно-технической интеллигенции, молодых специалистов, способных мыслить и действовать нетрадиционно.

Подготовка специалистов технического профиля, их численность, структура и квалификация — составные части научно-технического прогресса, повышения эффективности производства.

Важнейшим условием деятельного, творческого участия студентов технического профиля в ускорении научно-технического прогресса является формирование у них в процессе обучения в вузе марксистско-ленинского мировоззрения, идейной убежденности, ясного понимания общественных задач.

Жизненная позиция студента проявляется в различных тесно взаимосвязанных видах деятельности: трудовой, общественно-политической, духовно-творческой. Проведенные нами социологические исследования студентов технических вузов Праги, Кошице, Пльзеня, Либерец выявили в целом невысокий уровень их активности, хотя 84 % студентов состоят в Союзе социалистической молодежи (ССМ). Всего же руководителями научных кружков являются 3,8 %, членами общества сотрудничества с армией — 17, членами спортивных обществ — 67 %. Невысок и уровень профессиональной активности студентов. Только 21 % обучающихся в четырех вузах охотно посещает технические общества, самостоятельно готовит и защищает технические проекты, дипломы.

Однако и высокая техническая подготовка студента еще не обеспечивает ему четкую мировоззренческую позицию. В условиях острой идеологической борьбы, оголтелого антикоммунизма социалистическим странам